УДК 140.8

*Грыбаў Г.М., Грыбава І.Р.*

# СВЕТАПОГЛЯД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА І ПРАБЛЕМА ІДЭАЛОГІІ ДЗЯРЖАВЫ

Уладныя структуры нашай дзяржавы адназначна заявілі, што Рэспубліка Беларусь мае патрэбу ў сваёй ідэалогіі. Гэтая тэма стала шырока абмяркоўвацца грамадазнаўцамі, палітыкамі. Праведзены навуковыя канферэнцыі, выдадзены артыкулы і манаграфіі. Дыскусіі па названай праблеме паказалі, што асноўная большасць тэарэтыкаў важнейшымі кампанентамі ідэалогіі лічыць базавыя каштоўнасці народу і яго светапогляд. Ніхто не сумняваецца ў тым, што беларускае грамадства павінна вызначыць свой светапоглядны стрыжань, знайсці сваю філасофію. Філасофская культура чалавецтва за 2,5 тысячагоддзі накапіла мноства ідэй, падыходаў і накірункаў. Што з гэтага багацця павінна ўвайсці ў свядомасць нашага народа, якія "ізмы" для яго пераважныя? Пошук жыццевай філасофіі беларуса, на наш погляд, трэба пачынаць з вывучэння спадчыны, якую нам пакінулі прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты беларускага народа. Нацыянальныя мысліцелі [філосафы, дзяржаўныя дзеячы, пісьменнікі] ў сваіх творах і выказваннях адлюстроўвалі асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця беларускіх земляў, перадавалі дух нацыі, яе каштоўнасці, ідэалы і ментальнасць.

На фарміраванне грамадскай свядомасці беларускага народа, на светапогляд яго лепшых прадстаўнікоў аказвалі ўплыў наступныя асаблівасці і гістарычныя фактары:

1. Адсутнасць на працягу амаль усей гісторыі нацыянальнай дзяржавы з устойлівай назвай і стабільнымі межамі. На ранніх этапах станаўлення дзяржаўнасці нашы продкі жылі на тэрыторыях розных княстваў [Полацкае, Турава-Пінскае], складвалі аснову Вялікага Княства Літоўскага, уваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі і Савецкага Союза. Незалежнай дзяржаве пад назвай Беларусь крыху больш дзесяці гадоў.
2. Шматразовыя спробы барацьбы за незалежнасць і свабоду, у асаблівасці ў XVIII-XIX ст.ст., былі безвыніковымі. Паражэнні ў гэтай барацьбе прыводзілі да масавых уцекаў эліты грамадства за межы Радзімы. З канца XVIII ст. [паўстанне Т. Касцюшкі] і да нашых дзён адбылося дзесяць буйных эміграцыйных хваляў.
3. На беларускіх землях, з аднаго боку, існавала канкурэнцыя паміж каталіцызмам і праваслаў'ем, з другога, тут назіраліся талерантныя адносіны паміж рознымі рэлігійнымі канфесіямі і іх адносна мірнае суіснаванне.
4. Свядомасць беларусаў, якія аказаліся на рубяжы Ўсходу і Захаду, фарміравалася ва ўмовах уздзеяння на яе дзвюх цывілізацый і культур.

Якія ж асноватворныя ідэі пакінулі нам лепшыя розумы нацыі?

Мысліцель XII ст. Кірыл Тураўскі вучыў, што духоўная прыгажосць вышэй пачуццёвай, але апошняя ім не адмаўлялася. Найважнейшай каштоўнасцю ён лічыў розум.

Францыск Скарына, славуты прадстаўнік беларускага Адраджэння, спалучаў у сваім светапоглядзе рацыяналізм і веру ў Бога, думкі антычных філасофаў з ідэямі хрысціянства і Рэнесанса. Яму былі ўласцівы гуманізм, дэмакратызм, ён адстойваў ідэі роўнасці, справядлівасці і патрыятызму. Для Ф. Скарыны быў характэрны культ ведаў і мудрасці.

Выдатны прадстаўнік Рэфармацыі XVI ст. Сымон Будны быў скептыкам і рацыяналістам, які крытычна адносіўся да догмаў і аўтарытэтаў. Ён унёс значны ўклад у фарміраванне канцэпцыі творчай асобы, высока цаніў адукацыю і асвету.

Прынцып роўнасці ўсіх людзей перад законам, ідэю верацярпімасці адстойваў і праводзіў у жыццё "хросны бацька" Статута ВКЛ Леў Сапега.

За развіццё свецкай адукацыі выступаў мысліцель XVII ст. Сімеон Полацкі. Ён прапаведаваў гуманізм і высокае прызначэнне чалавека, спалучаў у сваіх філасофскіх поглядах рацыяналізм і сенсуалізм, асаблівасці і рысы ўсходняй і заходняй культуры.

Эклектык Казімір Нарбут, выступаючы за развіццё навукі, за вызваленне філасофіі ад багаслоў'я, адначасова прытрымліваўся думкі, што сапраўдныя веды рэлігіі не супярэчаць.

Гісторыка-філасофская спадчына Беларусі змяшчае і дастаткова радыкальныя меркаванні і падыходы. Гэта атэізм, геданізм і эпікурэйства Каспара Бекеша, светапогляд якога адзначаўся аптымізмам і разважнасцю. Перакананымі атэістамі былі Казімір Лышчынскі і Стэфан Лован, у выказваннях якіх мы таксама знаходзім крытычна-скептычнае стаўленне да свету, рацыяналізм і гуманізм.

У творах і выказваннях выдатных грамадскіх і літаратурных дзеячоў XIX ст. мы знойдзем імкненне абараніць нацыянальную культуру і мову, дэмакратызм і ідэю незалежнай беларускай дзяржавы. Трэба адзначыць, што яшчэ ў першай палове XIX ст. на тэрыторыі Беларусі прадстаўнікі інтэлігенцыі былі знаёмы з ідэямі нямецкай класічнай філасофіі. Стаўленне да яе было рознае. З аднаго боку, шэраг філософаў распаўсюджвалі ідэалізм і дыялектыку Гегеля. З другога – была крытыка Канта і Гегеля за абстрактнасць. Назіралася імкненне да сінтэза гегелеўскіх ідэй з прынцыпамі сацыялізма, да спалучэння "практыкі" Францыі і "тэорыі", "філасофскага духа" Германіі. У XIX ст. працавалі мысліцелі, якія негатыўна ацэньвалі рацыянальнае мысленне і ўзвышалі ірацыянальныя формы [інтуіцыя, фантазія, адкрыццё]. Рэлігія і паэзія прызнаваліся больш дасканалымі, чым філасофія, сродкамі спасціжэння ісціны. Меў месца тэзіс, што філасофскія ісціны не валодаюць універсальным характарам, яны нацыянальныя і прымальны толькі для аднаго народа. Заходняя філасофія [ідэалізм і матэрыялізм] і філасофія славян несумяшчальныя. Гісторыя філасофіі разглядалася як сума разрозненых сістэм і поглядаў. У той жа час, асобныя мысліцелі бачылі ў філасофскім працэсе цэласнасць, паступальнае разгортванне ісціны, а светапогляд асобнага народу разглядаўся імі як частка разгалінаванай цэласнай сістэмы.

У 70-ыя гады XIX ст. на Беларусі з'явіліся першыя звесткі аб працах К. Маркса. Узніклі асобныя марксісцкія кружкі. У перыяд першай рускай рэвалюцыі марксісцкую філасофію прапагандавала газета "Северо-западный край", ў той жа час шэраг выданняў распаўсюджваў несумяшчальныя з марксізмам ідэі пазітывізма [эмпірыякрытыцызма].

На пачатку XX стагоддзя з'явілася таленавітае філасофскае эсэ І. Абдзіраловіча [Канчэўскага], які тонка падмеціў нявызначанасць, кампраміснасць светаадчування і светаразумення беларуса, яго ваганні паміж Захадам і Ўсходам.

На аснове рэтраспектыўнага агляду ідэйнай спадчыны, створанай найбольш аўтарытэтнымі мысліцелямі Беларусі, можна зрабіць наступныя вывады.

1. Грамадская думка народа не ўяўляла сабою якую-небудзь адну дамінуючую філасофскую дактрыну. Яна змяшчала

***Грибова Ирина Григорьевна**, доцент каф. философии и культурологии Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

дастаткова вялікую колькасць разнастайных прынцыпаў і падыходаў.
2. Гістарычна-філасофская спадчына нацыі – гэта спалучэнне ідэй Захаду і Ўсходу, рацыяналізма, скептыцызма і веры, рэлігійнасці і бязбожнасці, памяркоўнасці і радыкалізма.
3. Прыярытэтныя ідэі і прынцыпы, якія складалі змест светапогляду беларускага народа, гэта: а] імкненне да рацыянальнага тлумачэння свету; б] культ ведаў і маральнасці; в] кампраміснасць, талерантнасць; г] абарона ідэалаў свабоды, роўнасці і справядлівасці; д] патрыятызм і гуманізм.

Ёсць неабходнасць асобна выказацца наконт апошняга гістарычнага перыяда развіцця светапогляду беларускага народа. Пасля ўваходу нашых тэрыторый у склад СССР, ён аказаўся пад моцным уздзеяннем марксістска-ленінскай ідэалогіі. Філасофія марксізма, дыялектычны і гістарычны матэрыялізм, былі прызнаны адзіным афіцыяльным і правільным тлумачэннем свету. Марксісцкі погляд укараняўся ў свядомасць людзей на ўсіх узроўнях адукацыі і выхавання. Савецкая сістэма дастаткова жорстка ставілася да рэлігіі, падтрымліваючы так званы "ваяўнічы атэізм". У сувязі з гэтым, трэба прызнаць, што дамінуючы ў савецкі перыяд марксізм не быў натуральным этапам развіцця светапогляду беларускага народа, працягам яго традыцый.

Светапогляд савецкіх гадоў меў ярка выражаны класава-партыйны характар. Усе сферы духоўнага жыцця: палітыка, мараль, культура, разглядаліся з пазіцыі інтарэсаў рабочага класа і пабудовы сацыялізма, камунізма. Прырода агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей амаль не вывучалася. Існавала меркаванне, што пралетарская класавая мараль утрымлівала ў сабе ўсё найлепшае з агульначалавечага, і яна аб'яўлялася вышэйшым узорам прагрэсіўнасці. Праўда, пазней у гэты тэзіс было ўнесена ўдакладненне. Не ўсё ў свядомасці, светапоглядзе рабочага класа можна браць як аснову агульначалавечага, а толькі лепшую частку, што было абазначана тэрмінам "класава-пазітыўнае".

З пачаткам працэса так званай "перабудовы" савецкага грамадства стала папулярнай ідэя апоры на агульначалавечыя каштоўнасці, а ўжо ў 90-ых гадах абгрунтоўваўся тэзіс іх прыярытэту. Абвяшчэнне верхавенства агульначалавечых каштоўнасцей спрыяла звароту да страчаных маральных традыцый, згубленага этычнага вопыту папярэдніх пакаленняў.

Што датычыцца каштоўнасцей нацыянальных, то іх месца ў грамадскай свядомасці нашага народа адназначна вызначыць складана. Ва ўмовах невыразнасці, нявызначанасці дзяржаўнасці нацыі, яе падпарадкавання другім дзяржаўным ўтварэнням, назіралася слабае ўсведамленне "тутэйшымі" этнічнай ідэнтыфікацыі. З другога боку, наша гісторыя змяшчае факты ўздыму нацыянальнай культуры, мовы, якія захаваліся, нягледзячы на ўціск і дыскрымінацыю. У XX стагоддзі мы перажылі дзве хвалі так званай "беларусізацыі": у 20-ыя гады і ў пачатку 90-ых гадоў. З'яўленне на палітычнай карце свету Рэспублікі Беларусь – гэта станоўчы фактар росту нацыянальнай свядомасці грамадзян краіны. Магчыма гэты працэс ідзе не так хутка, як хацелася б, але на тое існуюць аб'ектыўныя гістарычныя і палітычныя прычыны. У якасці ілюстрацыі прывядзем вынікі праведзенага намі ў 2000 годзе сацыялагічнага апытання студэнтаў Брэста і Мінска [1166 рэспандэнтаў]. Маладыя людзі адказвалі на пытанне "Якое значэнне надаеце Вы ў сваім жыцці наступным фактарам?" У шэрагу 24-х прыведзеных, "суверэнітэт маёй дзяржавы" займае 15-ю пазіцыю, "нацыянальная культура" – 21-ую. З другога боку, суверынітэт аценілі, як вельмі важны і важны, адпаведна 36,9 % і 45,4 % апытаных, а нацыянальную культуру – 20,5 % і 47,1 %. Такім чынам, існуюць падставы для аптымізма. Ёсць надзея, што паступова агульначалавечыя і нацыянальна-культурныя каштоўнасці стануць трывалым ядром свядомасці, светапогладу беларускага народа.

УДК 32д[430.1]

***Стрелец М.В., Шульга И.Н.***

# УЧАСТИЕ ХРИСТИАНСКО-СОЦИАЛЬНОГО СОЮЗА ФРГ В ФОРМИРОВАНИИ ЗЕМЕЛЬНЫХ ПРАВИТЕЛЬСТВ В КОНТЕКСТЕ ВНУТРИБАВАРСКИХ ПОЛИТИЧЕСКИХ РЕАЛИЙ: РЕТРОСПЕКТИВНЫЙ ВЗГЛЯД

На современном этапе развития постсоветских государств все большее значение приобретает осуществление политическими партиями властных функций на региональном уровне. В этой связи политики, эксперты могут обратиться к опыту зарубежных партий. Типичный пример – Христианско-социальный союз ФРГ, который без малого шестьдесят лет несет правительственную ответственность в германской федеральной земле Бавария. Этот аспект истории ХСС составляет объект настоящего исследования. Цель автора – обобщить опыт разработки стратегии и тактики ХСС по формированию земельных правительств.

Прежде всего, следует обратиться к истокам партии. Уже летом 1945 г. в Вюрцбурге, Мюнхене, других баварских городах образуются объединения с целью основать христианскую и демократическую партию для Баварии. Официальное функционирование "Христианско-социального союза в Баварии" как нового образования на земельном уровне было разрешено американской военной администрацией 8 января 1946 г.. Это партийное основание "между традицией и новой ориентацией" [3, с. 200], как попытка для образования христианско-консервативного собирательского движения, смогло быстро эталбироваться, хотя сначала разразилась борьба направлений и крыльев в вопросе, который личностно и содержательно привязан к старой БНП [Баварской народной партии]. К протагонистам этого курса относились представители "католико-этатистской группы" [3, с. 202] вокруг бывшего председателя БНП Фритца Шеффера, Алоиса Хундхаммера и крестьянские круги вокруг Йозефа Баумгартнера и Алоиса Шлегля. На другой стороне стояла "либерально-консервативная, христианско-интерконфессиональная группа [3, с. 202] вокруг Йозефа Мюллера, первого земельного председателя ХСС, крестьянского политика Михаэля Хорлахера и профсоюзного деятеля Хайнриха Креле. При исследовании истории и развития ХСС важно иметь в виду, что партия в первые послевоенные годы проходила сильные испытания на внутренний разрыв, которые влияли на ее положение в партийной системе и как коалиционного партнера [7]. На фоне этих напряжений понятно, что посредством этого новообразования, которое хотело быть

***Стрелец Михаил Васильевич****, д.и.н., профессор каф. социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
***Шульга Иван Николаевич,*** *Брестский государственный текхнический университет.*
*Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*